*Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі*

# ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 44 (4539) 20 лістапада 2009 г.

**Тыдзень таму ў сталічнай мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адкрылася ўжо адзінаццатая па ліку Рэспубліканская выстаўка работ лаўрэатаў, дыпламантаў і стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, якія атрымалі заахвочванні ў 2008 і 2009 гадах. Тут прадстаўлена 70 твораў, выкананых у самых розных тэхніках. Аўтарам — ад 10 да 24 гадоў: гэта выхаванцы дзіцячых мастацкіх школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў розных рэгіёнаў краіны, студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.**



# Прагноз на заўтра

**Талент абавязвае да асаблівай адказнасці не толькі таго, каму ён падараваны звыш, але і таго, хто знаходзіцца побач з маладым даравітым творцам: яго бацькоў, педагогаў. Як гэта важна: угледзець талент, захапіцца ім і падтрымаць, заахвоціць, памагчы раскрыцца, каб яго ўбачылі і адкрылі для сябе іншыя, а з часам — убачыў бы і захапіўся вялікі мастацкі свет.**

Традыцыйны, штогадовы праект, у якім удзельнічае даравітая і перспектыўная творчая моладзь з усёй Беларусі, заахвочаная спецыяльным фондам, — яшчэ адно пацвярджэнне клопату дзяржавы пра будучыню нашай айчыннай культуры. На гэта арганізатары выстаўкі — Міністэрства культуры краіны, спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, аддзел па рабоце з таленавітай моладдзю Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў — звяртаюць асаблівую ўвагу.

Падчас урачыстага адкрыцця экспазіцыі міністр культуры Беларусі Павел Латушка падкрэсліў, што выстаўка ладзіцца ў галерэі, размешчанай у Палацы Рэспублікі — знакавым месцы, дзе адбываюцца многія важныя падзеі. Так, агледзіны дасягненняў нашых юных талентаў — падзея таксама надзвычай важная і сведчыць пра тое вялікае значэнне, якое Прэзідэнт краіны надае працы з творчай моладдзю, бо яна будуе дарогу ў заўтра. Міністр падкрэсліў, што сёння ў Беларусі дзейнічаюць 522 школы мастацтваў, 21 сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова і тры ВНУ ў галіне культуры і мастацтва, а шматлікія конкурсы і фестывалі даюць дадатковыя магчымасці для выяўлення і развіцця адораных маладых людзей.

Старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі Ніна Мазай вызначыла гэтую выстаўку як плённы вынік працы і творчасці не толькі саміх аўтараў цудоўных работ, але і ўсіх тых, хто забяспечвае падтрымку талентаў — перадусім, іх педагогаў, бацькоў. Прамоўца выказала агульнае пажаданне: каб юныя творцы дасягнулі новых поспехаў і хутчэй знайшлі сваё месца ў вялікай сям'і беларускага мастацтва.

Творчасць самых яркіх прадстаўнікоў нашай моладзі ўжо зрабілася заўважнай з'явай на абсягу мастацтва. З Алесяй Скорабагатай, пераможцай Дэльфійскіх гульняў, неаднаразова адзначанай прэзідэнцкім фондам, мы ўжо знаёмілі чытачоў "ЛіМа". Гэтым разам імя 21-гадовай, не па гадах удумлівай і мудрай мастачкі, студэнткі трэцяга курса БДАМ, звярнула на сябе ўвагу шматлікіх наведнікаў вернісажа. І не таму, што ёй была дадзена магчымасць выступіць перад мікрафонам — ад імя ўдзельнікаў выстаўкі. А таму, што Алеся Скорабагатая прадставіла новыя выдатныя работы. Тут і жывое, уражлівае, "салодка" выпісанае алеем, палатно "Мёд" (добра помніцца яго першы публічны паказ на пачатку лета, падчас музычнага свята "Мірскі замак-2009"), і выкананы ў змяшанай тэхніцы густоўны аўтапартрэт, і жывапісныя сланечнікі ("Восень", ДВП, ляўкас, яечная тэмпера)...



Наогул жа, наватарства, свежы погляд, прагрэсіўнае слова ў свеце колеру і формы — адзнака лепшых работ, прадстаўленых у разнастайных жанрах выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну, фатаграфіі. Гледачы з цікавасцю аглядаюць жывапіс і графічную акварэль, кераміку і мастацкія фота. Затрымліваюцца ля "Партрэта вялікага дзядзькі Сярожы" (папера, аловак) Кацярыны Бяляўскай, чарапашкі-шкатулкі Наталлі Калягаевай (мастацкае саломапляценне), рэльефнага пано Антона Нічыпарука "Дадаць крыху" (сілумін), "Адзінарогаў" Вікторыі Голікавай (халодны батык), дызайн-праекта лёгкага рэльсавага транспарту для прыгарадных маршрутаў Алеся Фаменкі, калекцыі дасціпных сумак Аліны Грыгарэнкі для падлеткаў — з натуральнага лёну...

"Сёння педагогі ды мастацтвазнаўцы з цікавасцю сочаць за творчымі пошукамі маладых. У стасунках майстроў выяўленчага мастацтва з прадстаўнікамі маладога пакалення, якія ўжо заўтра будуць вызначаць стан айчыннай культуры, фарміруюцца не толькі прафесійныя веды, але і стаўленне да сэнсу творчай дзейнасці, да навакольнага свету, сваёй зямлі, адказнасць за ўсё, што з ёй было, ёсць і будзе..." — адзначае прарэктар па навуковай рабоце Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхал Баразна ў прывітальным слове, змешчаным у маляўнічым каталогу выстаўкі. Дарэчы, паглядзець яе варта кожнаму, неабыякаваму да прыгожага. Паблукаўшы па лабірынтах галерэі, можна паразважаць пра будучыню нашых юных талентаў і нават скласці прагноз на заўтрашні дзень айчыннага выяўленчага мастацтва. Чаму б і не? Выстаўка працуе да 19 снежня...

**Святлана БЕРАСЦЕНЬ**

***На здымках:** міністр культуры Беларусі Павел Латушка, старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі Ніна Мазай, рэктар БДУКіМ Барыс Святлоў адкрываюць выстаўку; на вернісажы — моладзь.*

*Фота Кастуся Дробава*

РЕПОЗИТОРИЙ